ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 82 (1049) | АЎТОРАК, 8-га красавіка 1930 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Да гадавіны соцспаборніцтва

ГАДАВІНА СОЦСПАБОРНІЦТВА — АГЛЯД НАШЫХ ПЕРАМОГ

Падрыхтоўка да гадавіны соцыялістычнага спаборніцтва ідзе яшчэ павольным тэмпам. Ідэя спаборніцтва ня ўсюды даведзена да варштату. Комсамольская організацыя яшчэ не мобілізавала ўсе свае сілы

Сустрэць гадавіну падрыхтаванымі

Правялі зьлёты

Барысаў рыхтуецца да першай гадавіны соцспаборніцтва. Вылучан штаб кіраўніцтва, які за кароткі тэрмін паставіў гэта пытаньне амаль ва ўсіх ячэйках, на шырокай нарадзе актыву. Праведзена ...маправерка ўдзелу комсамольскіх ячэек у выкананьні прамфінпляну, якая паказала слабы ўдзел комсамольскай ячэйкі ў гэтай справе.

Завод „Комінтэрн", які выканаў сваю програму на 100,6 проц., і той мае яшчэ некаторыя брыгады, якія не апраўдваюць свайго назначэньня.

З 1-га па 8-е красавіка былі скліканы зьлёты рабочай моладзі па пытаньню выкананьня прамфінпляну і ўдзелу моладзі. Гэтае самае пытаньне будзе перанесена на раённую конфэрэнцыю ўдарнікаў. Пастаноўлена вылучыць на грамадзкую гаспадарчую і савецкую працу 30 лепшых ударнікаў.

Па правядзеньню гадавіны соцспаборніцтва мобілізавана ...0 чалавек актыву, якія, разьбіўшыся на асобныя брыгады, будуць па прадпрыемствах і колгасах праводзіць падрыхтоўку да гадавіны.

Соня Фрыдлянд.

Комсамольцы ўперадзе

Завод „Дрэваапрацовачнік" (...енск) пачаў падрыхтоўку да гадавіны соцспаборніцтва. Усю падрыхтоўчую працу вядзе комсамольская ячэйка. У сучасны момант комсамольцамі праводзіцца праверка працы па цэхах, між якімі былі заключаны соцдагаворы. Комсамольская ячэйка стала зачынальнікам у гэтай справе. Яна праводзіць растлумачальную працу сярод заводзкіх рабочых аб значэньні соцспаборніцтва. Комсамольцамі зроблены дошкі для выяўленьня выкананьня соцдагавароў паміж цэхамі. Усё гэта сьведчыць аб тым, што комсамольская ячэйка разгарнула вялікую працу пасьля зімовай сьпячкі. На пытаньне ў беспартыйнага рабочага—„як працуюць комсамольцы, ці не адстаюць яны ад іншых?" пачуеце адказ:—„яны-ж комсамольцы, яны і павінны лепей ўсіх працаваць". З гэтага відаць, што комсамольская організацыя у апошні час стала на належную вышыню і не адстае ад намечаных планаў. Ударная брыгада заводу, якая складаецца з комсамольцаў і прыцягнутых да працы беспартыйных, таксама працуе добра, ідзе ўперадзе ўсіх рабочых. Рабочыя ...абы удзел прымаюць комсамольцы па уцягненьню беспартыйных у шэрагі КСМ. а іх ёсьць шмат. Ёсьць невялікая частка браку, які яшчэ ня выжыты. Прамфінплян у некаторых цэхах поўнасьцю ня выкананы. Усё гэта трэба ў хуткім часе выжыць і ліквідаваць. каб у бліжэйшым завод „Дрэваапрацоўнік" быў перадавым заводам у справе соцыялістычнага будаўніцтва.

БУЛЬКОТНЫ.

НОВА-БЕЛІЦА РЫХТУЕЦЦА

У Нова-Беліцы ўжо пачалася падрыхтоўка да сьвяткаваньня першай гадавіны соцспаборніцтва. Красавік месяц абвешчан ударным па выкананьню прамфінпляну па ўсіх прадпрыемствах Нова-Беліцы. Фабрыка **„Вэзуві"** і хэмічны завод **„Чырвоны Хэмік"**, якія за зрыў прамфінпляну знаходзяцца на чорнай дошцы, будуць праводзіць гэты месяц пад лёзунгам: „Да гадавіны соцспаборніцтва 29 красавіка дабіцца зьняцьця з сябе чорнай плямы і змагацца за чырвоную дошку".

1-га красавіка, пасьля працы, вакол фабрычных варот «Вэзувія» адбыўся мітынг, на якім рабочыя запэўнілі прадстаўнікоў **„Палескай Праўды"** і Чырвонай арміі ў тым, што да 1 мая „Вэзуві" зьніме сябе з чорнай дошкі. Красавік месяц павінен быць рашаючым у справе выкананьне ўсіх паказальнікаў прамфінпляну. РК комсамолу распрацаваў конкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньню сьвята першай гадавіны соцспаборніцтва. За гэты месяц наша комсамольская організацыя павінна праверыць выкананьне ўсіх дагавароў па соцспаборніцтву.

На сёньвешні дзень, калі мы возьмем дагавор, заключаны паміж рабочым колектывам фабрыкі «Вэзуві» і тэхнічным пэрсаналам, дык мы станем перад фактам, што гэты дагавор застаўся толькі кавалкам паперы, бо амаль што ўсе пункты яго засталіся нявыкананымі. Лесазавод „Колпраца" заключыў соцдагавор з рэчыцкім заводам імя Гомскага, але ніводнага разу не правяралася, як выконваецца гэты дагавор.

Што мяркуецца правесьці за гэты месяц? Вось некаторыя пункты пляну.

С 7-га па 15-е красавіка правесьці на ўсіх прадпрыемствах масавыя вытворчыя дні моладзі з пытаньнямі выкананьня прамфінпляну за першае паўгодзьдзе 1929-30 гаспадарчага году і зьвішчэньня прарываў у другім паўгодзьдзі (даклад гаспадарніка і садаклады комсамольскай ячэйкі).

На працягу гэтага месяца ячэйкі наладжваюць выезды ў падшэфныя вёскі і колгасы з мэтай дапамогі ў правядзеньні вясеньняй сяўбы, колектывізацыі, заключэньня соцдагавароў з ячэйкамі комсамолу, падшэфнымі нашай організацыі.

У пэрыод праверкі соцспаборніцтва ўдарныя брыгады павінны выявіць ілжэ-ударнікаў, пазбаўляючы іх званьня ўдарнікаў і высьвятліць цэлы шэраг іншых пытаньняў.

Будуць таксама праведзены заводзкія і раённыя зьлёты рабочай моладзі. Мы ставім перад сабою мэту, каб да гадавіны соцспаборніцтва ўцягнуць усю рабочую моладзь на ўсе 100 проц. у шэрагі КСМ.

Выкананьне мерапрыемстваў у значнай меры залежыць ад таго, як РК КСМ і комсамольскі актыў мобілізуюць увагу ўсёй комсамольскай організацыі, усёй рабочай моладзі на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, на барацьбу за выкананьне пяцігодкі ў найкарацейшы тэрмін.

Лепшых ударнікаў ударных брыгад, лепшыя цэхі, якія перавыконваюць намечаныя лічбы па прамфінпляну, трэба будзе прэміраваць.

Дрэнных ударнікаў ударных брыгад цэхаў, якія ганебна плятуцца ў хвасьце, трэба пазбаўляць званьня ударных і заносіць іх на чорную дошку.

Міхась Іткін.

Фрунзэўская рабочая конфэрэнцыя

„...Мы разам з партыяй"...

Праца другога дня конфэрэнцыі пачалася з працягу спрэчак па дакладу тав. Савінскага аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР.

Вакол дакладу разгарнуліся шырачэзныя спрэчкі. Першым выступіў таварыш з 9-й сталоўкі МЦРК, які сказаў:

— У нас ёсьць шмат недахопаў, але мы іх патроху выжываем. Цяжкасьці, якія стаяць на нашым шляху—пераможны, і мы іх пераможам.

Ад маладой шагачнай фабрыкі „1-е мая" гаворыць т. Садоўскі:

— У першым квартале прамфінплян у нас быў выкананы толькі на 42 проц., потым, дзякуючы шырокай растлумачальнай рабоце, дзякуючы энэргіі, ініцыятыве рабочага колектыву, у сакавіку мы ўжо маем выкананьне на 99 з пал. проц. Гэта лічба не канчатковая. Мы абяцаем, што ў самы найкарацейшы тэрмін выканаем і перавыканаем прамфінплян, таму, што разумеем, што лепшым адказам капіталістым на ўсе крыжовыя паходы будзе перавышэньне прамфінпляну.

На трыбуне—рабочы будаўнік:

— „Усе гэтыя крыжовыя паходы, усе гэтыя казкі аб прасьледваньні рэлігіі мы даўно ведаем. Гэтымі паходамі нас не запалохаюць. Мы кожную хвіліну гатовы з нашым авангардам—комуністычнай партыяй—даць адпор белагвардзейскай зграі.

Тав. Цукерман—работніца фабрыкі „Акцябр"—гаворыць:

— Наша фабрыка, якая мела раней прарыў у выкананьні прамфінпляну, цяпер яго пакрыла. Мы выканалі прамфінплян з перавышкаю.

Ад імя швэйнікаў гаворыць рабочы Мукасевіч:

— Швэйнікі ўразумелі стварыўшаеся становішча і абяцаюць ісьці разам з партыяй. Сёньня 10 чалавек з вытворчым стажам ад 20 да 23 год падаюць колектыўную заяву ў партыю.

Тав. Хазановіч—Рабочы „Эльводу"—адзначае вялізарны рост політычнай актыўнасьці рабочых. Ён спыняецца на лічбе сабекошту. У сярэднім сабекошт за час абвяшчэньня соцспаборніцтва зьнізіўся на 50 проц. Прамфінплян за першы квартал мы выканалі з перавышкай. Далей ён б'е трывогу, гаворачы, што Менск можа ў недалёкім будучым застацца без сьвятла, бо тут зусім дрэнна абстаіць справа з кадрамі. Ён прапануе організаваць курсы электраманцёраў.

Рабочы першай друкарні Юдзін рапартуе аб перавышэньні прамфінпляну і запэўнівае конфэрэнцыю, што 600 рабочых першай друкарні заўсёды гатовы па першаму закліку партыі даць адпор тым, хто перашкодзіць будаваць нам соцыялізм.

Турэцкі — рабочы заводу „Комунар":

— Зусім нядаўна на конфэрэнцыі ўдарнікаў мы рапартавалі трывожна, што прамфінплян на нашым заводзе значна ня выканаены. Сёньня я з гонарам гавару—плян мы выканалі з сумленнасьцю; ударніцтвам ахоплена 80 проц. рабочых. 8 беспартыйных рабочых падалі заявы ў партыю.

Рабочы Мукасевіч уносіць прапанову выклікаць на соцспаборніцтва рабочых Беластоку.

З энтузіязмам сустракаюць гэтую прапанову. Тут жа выбіраецца камісія па складаньню дагавору.

Заключэньнем дагавору і канчаецца работа сёньнешняга дня.

Цішка Верны.

Усім АК і РК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б 4-га красавіка прапанаваў неадкладна прапрацаваць артыкул тав. Сталіна „Адказы таварышам колгасьнікам" і пастанову ЦК УсеКП(б) аб новых ільготах колгасам на сходах парт. ячэек, на райпартсходах і г. д., адначасова ЦК патрабаваў разгортваньня шырокай кампаніі па популярызацыі гэтых вялікай важнасьці партыйных дакумэнтаў сярод шырокіх мас рабочых і бядняцка-серадняцкага сялянства, асабліва—сярод колгасьнікаў. ЦК патрабуе тэрміновай поўнай інфармацыі ЦК аб выкананьні дырэктывы ЦК ад 4-га красавіка.

Усе рэзалюцыі, пастановы сходаў, парт. актыву, парткамітэтаў тэрмінова прысылайце ў ЦК. Усякая маруднасьць у популярызацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і артыкулаў тав. Сталіна зьяўляецца злачынным падрывам справы колектывізацыі і правядзеньня вясеньняй сяўбы. З усёй рашучасьцю неабходна змагацца з фактамі супраціўленьня неадкладнаму правядзеньню ў жыцьцё пастаноў ЦК УсеКП(б) „Аб барацьбе з перагібамі ў колгасным будаўніцтве" і „Аб новых ільготах колгасьнікам" і дырэктыў, выкладзеных у артыкулах тав. Сталіна „Головокружение от успехов" і „Адказы таварышам колгасьнікам".

Сакратар ЦК КП(б)Б ВАСІЛЕВІЧ.

Нарастаньне вайны ў ПАЗШ

17-га сакавіка компартыяй і левымі профсаюзамі быў скліканы вялізарны мітынг протэсту супроць паліцэйскага ўціску і ўсё узрастаючага беспрацоўя.

Мітынг адбыўся ў Колізеі Бронкса ў Нью Ёрку і сабраў каля 25 тысяч дэмонстрантаў.



На здымку: Дэмонстранты пакідаюць Колізей.

Рэволюцыйныя пролетарскія калёны падрыхтоўваюцца да масавага наступленьня супроць дыктатуры фінансавага капіталу

БЭРЛІН, 6.—Адбылася нарада па пытаньні аб організацыі адзінага пролетарскага фронту, масавых забастовак і масавых дэмонстрацый у дзень 1-га мая. У нарадзе прынялі ўдзел рэволюцыйныя батальёны делегацыі, урадавыя асобы рэволюцыйнай профопозіцыі і прадстаўнікі пролетарскіх масавых організацый. Нарада зьвярнулася з адозвай да рабочых. У адозьве зазначаецца, што ў гэтым годзе першага мая павінна прайсьці пад знакам організацыі пролетарскага наступленьня супроць дыктатуры фінансавага капіталу і анты-савецкіх вайсковых падрыхтаваньняў імпэрыялістых.

Заклік швэцкай компартыі

СТОКГОЛЬМ, 6.—Комуністычная „Нью Даг" апублікавала адозву стокгольмскай організацыі компартыі Швэцыі да ўсіх профсаюзных саюзаў з прапановай прыняць удзел у першамайскай дэмонстрацыі пад кіраўніцтвам компартыі.

Марская конфэрэнцыя правалілася

За шыльдай пацыфічнай балбатні аб міры імпэрыялістыя рыхтуюцца да вайны

Апошнія падзеі на спасеньне Лёнданскай конфэрэнцыі па „разброеньню" як відаць зьвіклі. Францыя адмовілася ад сваёй уласнай „гэроічнай" прапановы абмежаваць марскія апэтыты ў абмен на „гарантыю бясьпечнасьці" з боку Англіі.

„Непрымірымасьць" Францыі лёгка тлумачыцца тым, што францускі імпэрыялізм ахвотна апэрыруючы звонкімі фразамі аб „міжнароднай салідарнасьці" і аб сьвяшчэнных абавязацельствах накладваемых Лігай Нацый, калі справа датычыцца інтарэсаў другіх дзяржаў, сам добра ведае цану гэтых дэкляраций і не пазьбягае карыстацца імі, калі справа ідзе аб яго уласных плянах і інтарэсах.

У № ад 31-га сакавіка афіцыёз францускага міністэрства замежных спраў „Тан", палемізуе з ангельскімі газэтамі і ангельскай делегацыяй, сьцьвярджаўшымі, што існуючыя дагаворы дастаткова гарантуюць бясьпечнасьць усіх членаў Лігі Нацый пісаў: „Урад Макдональда пацьвярджае сваю вернасьць духу і літары статуту Лігі Нацый, адмаўляецца ўказаць пры якіх умовах Вялікабрытанія гатова выканаць абавязацельства ўзаемнага падтрыманьня, якое выцякае з § 16 статуту Лігі". Адсюль „Тан" робіць заключэньне, што Англія, у прынцыпе прымаючая ўсе абавязацельствы, на справе хоча захаваць за сабою „свабоду дзейнічаньня". Францускі афіцыёз не памыляецца. Прыславутыя «гарантыі бясьпечнасьці» наогул—ня больш як пацыфічнае словаблудзіе. У момант міжнароднай імпэрыялістычнай сутычкі кожны з гарантаў усё роўна будзе дзейнічаць па свайму погляду і ў суадпаведнасьці са сваімі ўласнымі інтарэсамі.

Францыя патрабавала ад Англіі формальных абавязацельстваў роўнацэнных саюзнаму дагавору. Але на гэта патрабаваньне ангельскі імпэрыялізм пайсьці ня можа баючыся падпарадкаваць сваю політыку політыцы Францыі, ахвяраваць згоду з Амэрыкай і адпавіць супроць сябе Італію. Конфэрэнцыя можа з гэтага часу лічыцца праваленай па ўсіх пунктах, так як нельга сур'ёзна адносіцца да праекта „тройсьцьвеннай згоды".

У барацьбе за прамфінплян

ПА-БАЯВОМУ ПАПЯРЭДЗІЦЬ І ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫВЫ

Прарывы ў выкананьні прамфінпляну—ганебныя плямы на пролетарскіх заводах. Галавацяпы з заводу імя Ланцуцкага даводзяць да тысяч рублёў страты

Безадкладна ліквідаваць прарывы для далейшага пасьпяховага наступу

Гомельскі паравоза - вагонны рамонтны завод імя Ланцуцкага за першы квартал бягучага гаспадарчага году свае вытворчыя програмы па ўсіх відах рамонту рухавога саставу ня выканаў у сярэднім на 40,6 проц. Па рамонту паравозаў програма ня выканана на 67 проц. Назначана выпусьціць 18 паравозаў, а выпушчана ўсяго 6. Па капітальнаму рамонту пасажырскіх вагонаў заданьне недавыканана на 20 проц. Капітальнаму рамонту падлягала 20 вагонаў, а адрамантавана толькі 16. Па сярэднім рамонце програма выканана на 62,4 проц. Меркавалася адрамантаваць 59 вагонаў, а сапраўды адрамантавана 35. Гадавому агляду падлягала 132 вагоны, агледжана 94, што складае 66,2 проц. Па пабудове новых паштовых вагонаў програма недавыканана на 45 проц. Гэтыя жудасныя, ганебныя лічбы настойліва крычаць аб буйнейшых прарывах на заводзе. Адарванасьць трохкутніка заводу ад рабочай масы і правядзеньне мерапрыемстваў габінэтным парадкам зьявіліся галоўнай прычынай яго зрыву. Прарыў першага кварталу характарызуецца ня толькі недавыкананьнем програмы, але і невыкананьнем дырэктыў партыі і ўраду аб зьніжэньні сабекошту.

На сярэдні рамонт паравозаў адпушчана 5359 руб., выдатак-жа за першы квартал складае 12217 руб. на паравоз. На капітальны рамонт пасажырскага вагону адпушчана 5265 руб., выдаткавана—5292 р. На сярэдні рамонт вагона адпушчана 3619 р., выдаткавана 4004 р. Усе зазначаныя перавышэньні выдаткаў далі заводу каля 50 тыс. р. страты.

Соцспаборніцтва разгорнута слаба

На пасьпяховым выкананьні програмы адбілася: слабае разгортваньне соцспаборніцтва, адсутнасьць правільнага кіраўніцтва ўдарніцтвам з боку завкому, слабая дапамога адміністрацыі і слабы ўдзел яе ў соцспаборніцтве, з прычыны чаго асноўная маса рабочых ня было мабілізована на выкананьне прамфінпляну і зьнішчэньне ганебнага прарыву. На своечасовае выкананьне заданьняў па прамфінпляну адбіліся таксама асобныя выпадкі запіску самакрытыкі, ваплзвацельскія адносіны да працаноў рабочых. Дырэктыва партыі аб адзінаначальлі і рэорганізацыі прамысловасьці на заводзе не ўсьвядомлена і не праводзіцца ў жыцьцё. Завком ня кіруе ўдарнымі брыгадамі і вытворчымі комунамі. З 800 чалавек партыйцаў і комсамольцаў заводу налічваецца толькі 50 ударнікаў.

Галавацяпства, ці шкодніцтва?

З боку адміністрацыі заводу і рабочых няма поўнай увагі да выконваемай работы. Маецца шмат выпадкаў пераробкі работ, так, напрыклад: цягнік № 6999 быў затрыманы ў рамонце на 2 дні з прычыны перастаноўкі лапчатых зьвязак, няправільна ўстаноўленых. Пад вагон нумар 2007 заказалі восі, якія аказаліся з доўгімі шыйкамі, прышлося іх зьмяніць і патраціць вытворчы час. Вагоны нумар 524 і 3667 таксама прастаялі лішні час таму, што прышлося перастаўляць каламажкі, пастаўленыя задам наперад. Запорныя касьтылі паравых масьлёнак робяцца на паўдзюйма даўжэйшымі. Адліўка букс робіцца па шкэдніцку—вышыня адліваецца на 30 міліметраў больш чым трэба, шырыня—на 16 міліметраў. Стругальшчыку прыходзіцца траціць час для абстругваньня. Калі трэба вытачыць кальцо вагой у 9,6 кілёграма, дык для гэтага адліваецца балванка ў 43,2 кілёграма, токар павінен зразаць 33,6 кілёграма чыгуна на стружку. У выніку бясспрэчна шкодніцкіх адносін да працы і сваіх абавязкаў губяцца нерацыянальна дзесяткі чалавека-гадзін, што ў значнай меры ўздымае сабекошт.

Усе памянёныя факты кажуць за тое, што вакол зьніжэньня сабекошту павінна быць завострана асаблівая ўвага ўсяго трыкутніка заводу, з тым, каб другі квартал, які знаходзіцца пад пагрозай зрыву, паказаў рэальнае зьніжэньне сабекошту і выжыў халатнасьць, зьвязаную з безадказнымі праступнымі адносінамі да соцыялістычнай будоўлі.

У кавальным цэху востра адчуваецца недахоп нафтавых ячэек, што стварае чаргі каваль каля паравых молатаў. Самым вялікім процантам страт часу па кавальным цэху зьяўляецца прастой у часе работы—13 проц. усяго рабочага часу, шуканьне інструмэнтаў—6 проц., чаканьне каля паравых молатаў—10 проц. і толькі 71 проц. рабочага часу зьяўляецца сапраўдна-продукцыйнай працай. Вучот браку вырабаў, а асабліва пакоўкі адсутнічае.

Зрываецца спаборніцтва і выкананьне прамфінпляну

Уступаючы ў соцспаборніцтва, рабочыя шчыра ўпэўнівалі, што пасьпяхова выканаюць узятыя на сябе абавязкі. Але гэтыя запэўніваньні засталіся чорнай плямай на паперы. Яскравым падцьверджаньнем гэтага зьяўляюцца ганебныя адносіны групавода **Жукава** і яго „ударнай брыгады“ да працы. Цягнік № 5291, які павінен быў ісьці на першую спробу, быў затрыманы групаводам **Жукавым** у рамонце, дзякуючы крэйцкопфнаму валіку і падшыпнікам. Вагонны цэх абвясьціў сябе ўдарным, заключыў дагавор з Менскімі вагонна-рамонтнымі майстэрнямі па зьніжэньню сабекошту, па скарачэньню тэрміну прастояў вагонаў у рамонце, па ўзьняцьцю працдысцыпліны, папаўненьню васьмігадзіннага рабочага дня і г. д. Калі-ж прыглядзецца да працы цэху, дык адразу кідаецца ў вочы незацікаўленасьць большасьці рабочых у выкананьні гэтых абавязкаў.

Групаводы — партыйцы вагоннага цэху—**Гаравы і Сяргеенка** і па сёньняшні дзень не ўсьвядомілі сутнасьці соцспаборніцтва і барацьбы за прамфінплян. Разуменьне аб соцспаборніцтве і рацыяналізацыі іх цьмянае. Яны кажуць, што: **м... шын і людзей (якія знаходзя... ца каля машыны) у соцспабо... ніцтва ня ўцягнеш, бо машы... хутчэй пусьціць нельга (?!)** Несвоечасовая дастаўка матар'ял... з кладовых у цэхі адбіваецца ... ходзе ўсёй работы ў цэхах. К... даўшчыкі—Казачэнка і Бажана... ня гледзячы на шараг напамінан... няў аб неабходнасьці тэрміно... дастаўкі матар'ялаў, застаюцца ... гэтага пытаньня глухімі. Цэхав... адміністрацыя менш усяго цікаві... ца фінансавым бокам рамонту р... хавога складу і не папярэдж... выпадкаў перавышэньня выдатк... Такія адносіны да працы недап... шчальна тармозяць выкананьн... прамфінпляну, адбіваючыся ... ліквідацыі прарыву на заводзе і ... даюць магчымасьці мабілізаваць ув... рабочай масы вакол выкананьня в... творчай програмы.

Ганебна адстаюць

Пытаньні ўдарніцтва і соцс... борніцтва не зьявіліся цэнтральн... мі пытаньнямі заводзкага жыцьц... Асобныя ўдарныя брыгады ня м... конкрэтных заданьняў па выкана... ню прамфінпляну, а асобныя ўд... нікі спакойна склалі рукі, чака... чы кіраўніцтва ад завкому, які ... сёньняшні дзень ударна сьпіць. А... міністрацыя, інфармуючы рабоч... аб прарыве, галоўным чынам с... сылалася на „об'ектыўныя ўмов... і трусьліва хавалася за шыльд... гэтых умоў. **Неабходна адзн... чыць, што друкаваная завод... кая газэта „Цягнік Соцыялізм... ня здолела мабілізаваць г... мадзкай увагі вакол выкана... ня прамфінпляну.**

Партыйны і комсамольскі кол... тывы заводу па сапраўднаму змагаліся за прамфінплян, не кі... валі ўдарніцкім рухам, не паказ... лі прыкладу ўдарніцтва, ня бачы... што недавыкананьне асобных па... зальнікаў вытворчай програмы ... сягнула ганебнейшай лічбы 67 ...

Віт. Сідарук

Гомель.

Цяжкае раздум'е

Для шмат якіх прадпрыемстваў другі квартал не зьявіўся рашаючым у выкананьні гадавой програмы.



„Трохкутнік“ хорам:—„Об'ектыўныя“ прычыны пад увагу ня прымуць. Якія-б яшчэ прычыны вынайсьці?



Мы зьбіраемся на Дняпроўскія парогі. Уяўленьня аб іх мы ня маем, ня гледзячы на тое, што кожны ведае пра іхнае існаваньне. Тут якраз прыстасаваць бы прыказку: „Мала ведаць—трэба бачыць“.

Так, каб ведаць што колечы аб парогах,—трэба іх бачыць...

* * *

А 6-й гадзіне раніцы 30 чэрвеня мы былі ужо каля дубу, на беразе Дняпра. Дуб—гэта дубовая, моцная, даволі вялікая лодка з двума парамі вёсел, парусам.

Нас усіх 22. Лоцман, памоцнік лоцмана, трое грабцоў ды нас 17.

Сьцеражэцеся!—Крыкнуў памоцнік лоцмана, падстаўляючы парус пад ледзь-ледзь чутны вецярок. І мы імчымся—„на парусе па Дняпры“, уніз к парогам...

За Днепрапятроўскам на Дняпры зьяўляюцца даволі вялікія хвалі, і рытмічна гойдаюць яны наш дуб, ліжучы барты яго сваімі гострымі верхавінкамі-грабенчыкамі.

А лоцман Адрый Білокін пільна стаіць на варце, на рулі... Ён ведае, якую адказнасьць узяў на сябе, бяручыся перавезьці нас праз парогі.

Кожная мясьцінка, кожны камень яму за 42 гады лоцманства вядомы, і ён углядаецца на Днепр далёка, далёка наперад...

Там, дзе неба сплываецца з Дняпром,—на небасхіле першы парог. Прытоена слухаем гул. Дуб пачало больш моцна падкідаць.

Нас падхапіла плынь... адчуваем, як ляцім уніз, нібы па ступеньках... Вада зносіць дуб, упарты руль лоцмана надае дубу патрэбны кірунак. Усё прытаілася... Праяжджаем-жа праз парогі... то сям, то там—з-пад вады тырчаць гострыя камяньні. А што, калі наскочым на адзін з іх. Трэсьне дуб, і тады што рабіць, за што схапіцца?..

Хляснула зялёная хваля аб камень, абабіла свае бакі і з рэвам накінулася на нас... Хляснула. Заліла нечакана вадою дуб, нас... нырнула лодка яшчэ ніжэй на ступеньку і як страла кінулася наўцёкі ад праеханага намі Кадацкага парогу. Азірнуліся ўсе назад. На некалькі мэтраў мы ніжэй ранейшага ўзроўню вады...,

— Ня так ужо і страшна—асьмеліліся мы, вытрымаўшы баявое хрышчэньне.

— А ўперадзе яшчэ восем парогаў..- Магутная музыка песьні...

„Рэве тай стогне
Днiпр широки“...

Не знаходзіць сабе водгаласу сярод неабсяжных прастораў вады...

Праехаўшы другі—Сурскі парог—куды меншы за першы парог—Хадакі—наш дуб імчыцца да наступнага, Лашанскага парогу. Хлопцы пасьмялелі, прапала ранейшая апаска...

Няўпрыкмець пад'ехалі да Лаханскага парогу. Падхапіў струмень наш дуб, рванула ўніз, а праз якую хвіліну парог застаўся ззаду... Лаханскі парог—адзін з вялікіх парогаў, аднак, пры няўмелым кіраўніцтве дубам, пераплысьці парог небясьпечна, бо на парозе страшэнныя віры, і віраплынь можа павярнуць дуб бокам, а тады напорам вады і перакуліць...

— Зараз будзе Званецкі парог—сур'ёзна заяўляе лоцман, а там цягінка і самы страшны Ненасыцец.

* * *

Гадзіньнікі паказваюць першую гадзіну. Ззаду—параўнальна спакойны Днепр—наперадзе грохат і шум... Над Ненасытцам зусім нізенька стаіць воблачка... Вада разьбіваецца аб каменьні на пыл... Ненасыцец—самы страшны парог. Адна назва характарызуе яго, як самага страшнага... Ахвяры, ахвяры... А ён вечна галодны... ненасытны...

Гул аглушае нас. Са спалохам глядзім на пекла... Няўжо мы паедзем і праз Ненасыцец? Немінуючая пагібель. Кіпіць вада і з рэвам ліжа каменьні, ад шпаркасьці плыні кружыцца галава...

— Граб... камандуе лоцман, і чацьвёра грабцоў налеглі на вёслы...

Як толькі струмень хацеў падхапіць наш дуб і панесьці па каменьнях Ненасытца, здаравенная рука лоцмана паварачвае руль, дуб крута паварочваецца і мы кармою прычальваем ля самага пачатку Ненасытца—да касы, што падзяляе Днепр на дзьве часткі: на парог і канал... Канал—гэта той-жа парог, толькі розьніцца ён ад парогу тым, што чалавечыя рукі павырывалі з дна каменьні—ачысьціўшы гэтым самым шлях ад падводных каменьняў...,

Рэў, стогн, грохат, шум, сьвіст—цяжка словамі перадаць тую магутную музыку перьмогі, з якою стары адвечны Дняпро перабіраецца праз Ненасыцецкі парог...

Ненасыцец праяжджалі каналам, частка-ж экскурсантаў прайшлася па касе, любуючыся непасрэднай блізкасьцю магутнай велічы парога...

* * *

На поўдзень мы спыніліся ля Воўніцкага парогу, ніжэй Ненасытца. Скалы. Няма расьліннасьці. Рыбакі на парозе ловяць рыбу. А высока на гары—сяло Воўніч...

* * *

Да змайстраванага з кійкоў трыножніка падвешана вялічэзнае вядро. Гатуецца наш полудзень,—юшка з сьвежай рыбы...

— Ну, як рыбы, многа?—пытаю дзеда.

— Эт, дзе там... Няма цяпер рыбы. Як Дніпрэльстан пачалі будаваць, дык і рыбы ня стала. Кажуць, што перамычкай Дняпро перагарадзілі.

Адкуль-жа тая рыба? Рыба-ж з мора ідзе... Дойдзе да перамыч і, няма праходу, дык назад у Адэсу, у мора... Няма рыбы.

Я адчуў, што Дніпрэльстан—... лючае пытаньне для дзеда.

Я хачу суцешыць дзеда, х... сказаць:

— Не шкадуй, дзед, Дняпр... сваёй рыбацкай хацінкі сярод ... ных скал... Не шкадуй у імя Д... прэльстана, які дасьць элект... нэргію Днепрапятроўшчыне, М... лаеўшчыне, Адэсчыне. Мэліто... шчыне, Запарожжу, дасьць э... траэнэргію ў тваю новую ха... хатку-перасяленца, не шкадуй ... імя Дніпрэльстана, дзякуючы ... му Днепр стане судаходнай рэч... і зьвяжа непасрэдным шля... Балтыцкае з Чорным морам...

У імя ўсяго гэтага ня трэба ... даваць, ня варта шкадаваць св... старэнькай, як ты сам, хаткі...

Згадзіся і саступі дарогу нов... маладому.

* * *

Праяжджаючы на дубе, мо... лёгка прыкмеціць сярод стэп... сям, то там высачэзныя курган... магілы...

Замест шырачэзных прасто... Дняпра на Кіеўшчыне і Днепр... троўшчыне,—гранітныя берагі ... моцна трымаюць сівога ў с... абоймах. Рэчышча звузілася. Дн... тут затое вельмі глыбокі. Цені ... сокіх чорных берагоў падаюць ... ваду, ад таго і вада тут замест ... рабрыстай здаецца ня то сіняй ... то чорнай.

Мы каля Кічкасу.

Надвесны жалезны мост на с... шэннай вышыні здаецца магу... жалезнай аркай... Перад намі ... гортваецца вялічэзная пана... будаўніцтва. Гэта—будуецца Д... роўская электрычная станцыя ... рацей—Дніпрэльстан...,

Прыцягваем баявы агляд падрыхтаванасьці да сяўбы

ГАТОВЫ ДА БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ

Колгасы: „Чырвоны Маяк", „Савецкая Беларусь", „Грамада" і „Чырвоны Агароднік" рапартуюць аб сваёй падрыхтаванасьці да выхаду ў поле

ПЕРАВЫКОНВАЮЧЫ ПЛЯНАВЫЯ МЕРКАВАНЬНІ, УСЕ КОЛГАСЫ ПАВІННЫ ПАДРЫХТАВАНА СУСТРЭЦЬ І ПРАВЕСЬЦІ ВАЖНЕЙШУЮ ПОЛІТЫЧНУЮ ЗАДАЧУ ПАРТЫІ НА ВЁСЦЫ—ВЕСНАВУЮ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧУЮ КАМПАНІЮ

Комсамольскія ячэйкі—ударныя групы ў правядзеньні гэтай работы

Вясеньнюю сяўбу правядзем з посьпехам

канцы сакавіка г. г. адбылася ная конфэрэнцыя колгаснай мо- Астрашыцка Гарадзецкага раё- На конфэрэнцыі прысутнічала дэлегатаў.

нфэрэнцыя прапрацавала пы- не колектывізацыі і падрых- да вясеньняй пасеўнай кам- . Па дакладу аб становішчы снага будаўніцтва і вясеньняй ы разгарнуліся спрэчкі. Многа упала колгасьнікаў, уносячы тычныя прапановы, а таксама ы характарыстыку рабоце сваіх асаў.

Апрача пытаньня падрыхтоўкі пасеўнай кампаніі, цесна ўвязвалася пытаньне і аб вытворчай працы ў колгасе, аб стварэньні рабочых вытворчых плянаў, аб ачыстцы насеньня, рамонце інвэнтара, цягавой сіле і інш.

Конфэрэнцыя прашла пры надзвычайнай актыўнасьці моладзі і паслужыла значным штуршком упе- рад.

ЛЯВІЦКІ.

Сяўба ідзе



На здымку: работа сеялак у полі.

Усю работу на рэйкі соцспаборніцтва

Організавалі ударныя брыгады

У колгас „Савецкая Беларусь", Сьмілавіцкага раёну, ьля абагуленьня рабочай жывёлы, сельска-гаспадарчага інтара, колгасьнікі прыступілі да практычнага, поўнага афорньня колгасу. Тут адразу ўвязалася пытаньне, як разьмераць рабочую сілу колгасу. Як лепш прыступіць да падрыхкі к сяўбе.

На сёньня ў колгасе ўжо створаны праз добраахвотьць ударныя брыгады: жывёлагадоўчыя, паляводчая, брыа канюхоў і інш. Брыгады працуюць добра. Для кіраўніцт- брыгадамі вылучан старшыня.

Работа брыгад падпарадкавана мэтадам социялістычна- спаборніцтва, што павялічае якасьць работы брыгад у аве замацаваньня колгасу і падрыхтоўкі да вясеньняй бы.

М. Піскун.

Шпаркім тэмпам

Колгас «Грамада», Смалявіцкага раёну, Азарыцка-Слабодзкага сельсавету організаваўся яшчэ ў 1927 годзе на 150 гектарах зямлі. У ім налічвалася ўсяго 5 гаспадарак вёскі. Зараз колгас узбуйнены. Вёска поўнасьцю і суседнія хутары далучыліся да колгасу.

Колгас цяпер праводзіць шпаркім тэмпам работу па падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Для плянавасьці і распарадку ў рабоце колгасу створаны ўдарныя брыгады па выкананьню пэўных галін работы.

Колгас падрыхтаваным выступіць у поле для правядзеньня бальшавіцкай сяўбы.

Г. А.

Профшкольцы адрамантавалі 80 плугоў

На паседжаньні бюро колектыву Аршанской профшколы абгаварваліся кандыдатуры вучняў, пасылаемых на работу ў падшэфны раён суцэльнай колектывізацыі.

Адзінаццаць чалавек профшкольцаў былі ў колгасе „Іскра", Круглянскага раёну.

Разгарнулі работу.

Мігам было ўсё організавана. Рамантавалі плугі, машыны і прылады. Сяляне бралі прыклад з працы брыгадзіраў. За 10 дзён многа зроблена брыгадай як у справе рамонту інвэнтара, так і правядзеньня грамадзкай работы. За гэты час адрамантавана 80 плугоў і шмат іншых с.-г. прылад.

Такія выезды брыгад даюць вялікую дапамогу колгасам у справе падрыхтоўкі да сяўбы.

Возьмем курс на большую колькасьць пасылаемых брыгад у вёскі.

Габрылец Міхась.

„Чырвоны Агароднік" абвясьціў сябе ўдарным

Колгас „Чырвоны Агароднік" (Пятрыкова, Мазырская акруга) зьяўляецца сэкцыяй колгасу „Гігант".

У сакавіку месяцы колгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнымі па правядзеньню вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Зараз ужо колгасам вывозіцца гной у поле. Прыцягнуты ўсе калгасьнікі да актыўнай работы па хутчэйшай падрыхтоўцы к правядзеньню сяўбы.

Комсамольская ячэйка ў падрыхтоўцы амаль ня прымае ніякага ўдзелу. Трэба каб комсамольцы былі застрэльшчыкамі—ударнікамі ва ўсёй рабоце колгасу.

Міша.

Два прыклады

Колгас „Чырвоны Маяк" Сераж- скога сельсавету, Слуцкага раёну на сёньнешні дзень ужо падрыхтаваўся к выхаду ў поле. Інвэнтар адрамантаваны два тыдні таму назад.

Праўленьне колгасу мобілізавала ўсіх колгасьнікаў на падрыхтоўчую работу: загатоўку дроў, адрамантаваньне вазоў, прыгатаваньне вяровак і інш.

Насеньне поўнасьцю ачышчана і падрыхтавана да засеву вызначанага яравога кліну. Харчамі колгас забясьпечаны. Цягавае сілы колгас мае дастаткова.

Колгас падрыхтаваным выйдзе ў поле.

У гэтым-жа сельсавеце ёсьць колгас „Вольны Край", які вельмі слаба вядзе работу па падрыхтоўцы выхаду ў поле. Інвэнтар не адрамантаваны. З насенных культур ачышчан толькі авёс.

У колгасе няма вучоту насеньня, забясьпечанасьці харчамі жывёлы. Колгас яшчэ не зямляўпарадкаваны не адведзена плошча пад яравы клін.

Трэба папрацаваць, каб організаваць работу к выхаду ў поле.

Аса.



Ударніцы рамантуюць трактар

Ударнікі за працай

Ударныя брыгады, організаваныя Санюкоўскай ячэйкай ЛКСМБ, Каралінскага раёну, Мазырскай акругі, разгарнулі шырока работу па падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўнай кампаніі і збору сродкаў на пабудову трактарнай калёны.

У шасьці населеных пунктах сельсавету зроблены падворныя абходы, у выніку чаго сабрана каля 1000 кілёграм жалезнага лому. Зараз ударнікі зьбіраюць попел.

Поўным ходам ідзе 100-працэнтная ачыстка насеньня па ўсім сельсавеце.

Ударныя брыгады апраўдваюць сваю назву. Ударнікам у рабоце дапамагае і беспартыйная моладзь.

З. Кузьменка.

Аб ходзе колектывізацыі і падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі*)

[Рэ]золюцыя пленуму ЦК КП(б)Б па дакладу тав. ГАЛАДЗЕДА

) Скончыць ачыстку насеньня і за на гатунковае ў разьмеры, вызнам у пляне пасеўнай кампаніі.

Прыняць рэальныя меры да саўднага ажыцьцяўленьня пастаноў о ЦК і СНК БССР аб разьвіцьці ёлагадоўлі ў разьмерах, вызнача- у паказаных пастановах, як важшай праблемы ў разьвіцьці сель- гаспадаркі БССР.

Устанавіць спэцыяльны кантроль падрыхтоўкай да веснавой сяўбы з ўсіх савецкіх гаспадарак, дабіўся поўнага засеву савгаскіх палёў абліва пашыраных савгасаў.

) Забясьпечыць поўнае і безагаворнае выкананьне, як з боку савга- і колгасаў, так і з боку ўсіх індуальных гаспадарак, аграмінімуі зоомінімуму.

) Даручыць парторганізацыям, РВК льсаветам абавязаць колгасы, саўы і камітэты сялянскай узаемадаогі прыняць усе меры па засеве лі, адабранай ад кулакоў.

. Недастатковая праца з беднатой, ушчаныя перагібы і скажэньні лі- партыі: прымусовая калектывіза- і перагібы ў абагуленьні жывё- а таксама актывізацыя клясавага супіўленьня кулака, які скарыстоўва- гэтыя перагібы, разьвівае шалёнае змаганьне за ўплыў на серадняка, за выхад серадняка з колгасу, з тым, каб весьці змаганьне супроць колгасаў, за іх разбурэньне, прывялі ў некаторых мясцох да выхаду паасобных груп сераднякоў з колгасаў і разбору абагуленай маёмасьці. Гэта паказвае, што ня гледзячы на тое, што шырокія масы серадняков ідуць па шляху колектывізацыі, у некаторых мясцох назіраюцца выпадкі хістаньня серадняка.

Задача ўсіх партыйных організацый заключаецца ў тым, каб разам з выпраўленьнем дапушчаных перагібаў павесьці самае бязьлітаснае змаганьне з імкненьнем кулака скарыстаць дапушчаныя памылкі з мэтай змаганьня з колгасамі і пашкодзіць пасьпяховаму правядзеньню пасеўнай кампаніі, улічваючы, што асноўнай і рашаючай політычнай задачай партыі зьяўляецца задача канчатковай ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Трэба мабілізаваць увагу ўсёй партыі на разьвіцьці энэргічнай работы па арганізацыі груп беднаты і батрацтва, на ўзмацненьні блёку беднаты з серадняком пад кіраўніцтвам рабочае клясы і яе камуністычнай партыі і на гэтай падставе даць рашучы адпор кулаку, які імкнецца скарыстаць гэтыя хістаньні серадняка.

5. Не гледзячы на цэлы рад дырэктыў, дадзеных з боку бюро і пленуму ЦК КП(б)Б аб усямерным узмацненьні груп беднаты і іх работы, пленум ЦК адзначае, што на мясцох ня ўсімі арганізацыямі надаецца належная ўвага рабоце з беднатой і батрацтвам, а ў радзе выпадкаў назіраюцца зусім нецярпіма злачынныя і нядбайныя адносіны да арганізацыі груп беднаты ў калгасах і пры сельсаветах і да наладжваньня іх работы.

Адначасова пленум ЦК адзначае зусім нездавальняючае партыйнае кіраўніцтва работай сярод працоўных жанчын. Не праводзіцца клясавы падыход у сэнсе асобнай работы з батрачкамі і бядначкамі ў барацьбе за ўплыў на серадначак, якіх у першую чаргу скарыстоўвае кулак у сваёй барацьбе супроць калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, правядзеньня пасеўнай кампаніі і г. д.

Пленум катэгарычна прапануе выканаць дырэктывы ЦК аб рабоце сярод батрачак і бядначак, актывізацыі дэлегацкіх сходаў, дабіўшыся сапраўднага пераходу да новых форм работы парт організацыі сярод жанчын.

Пленум ЦК з усёй рашучасьцю падкрэсьлівае перад усім організацыямі, што наладжваньне работы батрацка-бядняцкіх груп зьяўляецца цэнтральнай арганізацыйна-палітычнай задачай партыі ў вёсцы. Недаацэнка гэтай задачы, а таксама спробы разважаньня аб тым, што „ў колгасах усе роўныя і непатрэбна там арганізаваць групы беднаты, каб не пакрыўдзіць серадняка"—ёсьць па сутнасьці недаацэнка клясавай барацьбы ў вёсцы, уступка і дапамога кулаку, што павінна кваліфікавацца як самае яскравае выражэньне правага апартунізму. „Толькі чужыя партыі і ЎсеЛКСМ элемэнты могуць ігнараваць гэтую асноўную задачу партыі—задачу арганізацыі беднаты і батрацтва".

6. Пленум ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае недапушчальнасьць адміністрацыйнага зачыненьня царквей і маліцьвенных дамоў бяз удзелу шырокіх мас працоўных, як гэта мела месца ў радзе выпадкаў. Барацьба за вызваленьне шырокіх працоўных мас ад рэлігійнага дурману зьяўляецца адной з важнейшых палітычных задач нашай партыі, але выкананьне гэтай задачы партыі патрабуе абавязковага ўцягненьня ў гэтую адказную работу па барацьбе супроць уплыву рэлігіі, шырокіх колаў працоўных мас і недапушчэньня адміністрацыйных перагібаў. Зачыненьне царквей, сінагог і касьцёлаў можа праводзіцца толькі на падставе ініцыятывы і актыўнасьці шырокіх мас у барацьбе супроць рэлігіі

7. Ня гледзячы на цэлы рад дырэктыў, дадзеных з боку бюро ЦК аб узмацненьні работы сельсаветаў ў справе калектывізац і з паказаньнем на тое, што сельсаветы і райвыканкомы сапраўды павінны стаць на чале калгаснага будаўніцтва, пленум ЦК адзначае, што гэтыя дырэктывы ня выкананы і ў многіх мясцох сельсаветы да гэтага часу цягнуцца ў хвасьце колектывізацыі.

Пленум ЦК даручае ўсім партарганізацыям сапраўды дабіцца такога становішча, каб роля сельсаветаў, райвыканкомаў і наогул савецкага апарату ў справе колектывізацыі была пастаўлена на належную вышыню і каб сельсаветы зьявіліся сапраўднымі арганізатарамі беднаты, батрацтва і серадняка ў справе суцэльнай калектывізацыі сельскае гаспадаркі БССР.

8. Пленум ЦК КП(б)Б зварачаецца да ўсіх членаў КП(б)Б, членаў КСМ, да ўсіх рабочых, батракоў, калгасьнікаў і да бядняцка-серадняцкіх мас сялянства з заклікам мабілізаваць усю сваю ўвагу на замацаваньні калгаснага будаўніцтва і на яго далейшым пасьпяховым пашырэньні, на правільнай арганізацыі сяўбы, пашырэньні пасеўных плошчаў, рашуча выпраўляючы на хаду дапушчаныя перагібы і скрыўленьні, кіруючыся дырэктывамі ЦК УсеКП(б).

Неабходна ў яшчэ большым разьмеры падняць актыўнасьць рабочае клясы на выкананьне задач калектывізацыі і правядзеньне пасеўнай кампаніі. Неабходна мабілізаваць усю энэргію і сродкі на пасьпяховае выкананьне плянаў пасеўнай кампаніі ў саўгасах, калгасах, індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках, устаноўленых партыяй і ўрадам. Неабходна веснавую пасеўную кампанію зрабіць сапраўднай бальшавіцкай кампаніяй.

9. Пленум ЦК даручае ўсім парт-арганізацыям прыняць захады да ўсебаковага вывучэньня гэтай пастановы. Рэдакцыям газэт зьвярнуць асаблівую ўвагу на шырокую папулярызацыю ў друку бліжэйшых задач партыі, дабіваючыся шырокай мабілізацыі працоўных мас на барацьбу са скрыўленьнямі лініі партыі і на забесьпячэньне далейшых посьпехаў калектывізацыі і на падставе калекты- ліквідацыі кулацтва, як клясы.

(Канец)

*) Пачатак гл. ва ўчарашнім нумары

У дапамогу дакладчыку

ТЭЗІСЫ ДА АНТЫВЯЛІКОДНАЙ КАМПАНІІ

1. Буйны размах соцыялістычнага будаўніцтва, шпаркі тэмп разьвіцьця прамысловасьці, асабліва буйнай, як базы індустрыялізацыі, перавышаючы ўсё плянавыя паказчыкі, буйны рост колектывізацыі—усё гэта ў корані мяняе соцыяльна-экономічныя суадносіны нашай краіны. Характэрным для сучаснага моманту зьяўляецца тое, што ўсьлед за бедняком у буйныя колектыўныя гаспадаркі ідзе асноўная маса серадняцтва, і мы зьяўляемся сьведкамі працэсу колектывізацыі цэлых раёнаў і вобласьцяй.

Сельская гаспадарка з посьпехам ідзе да буйнай машынізаванай вытворчасьці: гэты працэс вялікай тэхнічнай рэволюцыі, якога ня ведала і ня ведае ніводная капіталістычная краіна, зьявіўся вынікам замацаваньня буйнай індустрыі, як падмурку перабудовы усёй гаспадаркі.

2. У пытаньнях індустрыялізацыі краіны і перабудовы сельскай гаспадаркі на новых соцыялістычных падставах, у сучасны момант для нас маюць рашучае значэньне тэмпы разьвіцьця. Гісторыя патрабуе ад нас больш хуткага фарсыраванага тэмпу разьвіцьця народнай гаспадаркі. бо мы павінны ня толькі дагнаць, але і перагнаць перадавыя ў тэхнічных адносінах капіталістычныя краіны.

3. Першы год пяцігодкі зьявіўся паказальным у тых адносінах, што прадугледжаныя ў пяцігадовым пляне тэмпы аказаліся ня толькі рэальнымі, але і перавышанымі. Аб гэтым сьведчаць наступныя паказчыкі:

Па 5-гадоваму пляну бюджэт на 1928-29 год намячаўся ў суме 7 мільярдаў 762 міліёнаў рублёў, а ў сапраўднасьці ён дасягнуў 8 мільярдаў рублёў з лішкам. Павялічэньне прадукцыі буйнай соцыялістычнай прамысловасьці меркавалася на 21 проц., а фактычна яна павялічылася на 23,7 проц. На 1929-30 год па 5-годцы намячалася павялічэньне прадукцыі соцыялістычнай прамысловасьці на 21,5 проц., а па кантрольных лічбах, зацьверджаных Пленумам ЦК УсеКП(б), намечан рост на 32 проц., г. зн. на 11 проц. вышэй. Рост прадукцыі буйнай прамысловасьці намячаўся на бягучы год на 26 проц., а па кантрольных лічбах, зацьверджаных Пленумам ЦК УсеКП(б), намечан рост на 45,1 проц.

У галіне разьвіцьця сельскай гаспадаркі мы таксама маем значны рух, асабліва ў організацыі буйных агрмаджаных гаспадарак. У 1927 годзе мы мелі ў нашай краіне 14.800 колгасаў, у 1928 г.—33.200, у 1929 г. — 60.000, а ў 1930 г. — намячаецца 103.000 колгасаў. Па 5-гадоваму пляну было намяркована 14.5 міліёнаў га пасеву пад калгасамі толькі к канцу 5-годкі, а па намечаных і зацьверджаных Пленумам ЦК УсеКП(б) кантрольных лічбах мы будзем мець у 1930 годзе 15.5 мільёнаў га колгаснага пасеву, г. зн. на 1 мільён больш, чым намячалася к канцу 5-годкі.

Па БССР у мінулым годзе ўкладаньні ў капітальнае будаўніцтва прамысловасьці складалі 24 мільёны, а ў гэтым годзе мы ўкладваем у капітальнае будаўніцтва прамысловасьці 62 міліёны.

Прамысловасьць за першы квартал г. г., у параўнаньні з мінулым годам, дае рост валавой прадукцыі 69,6 пр., рабочай сілы—26 проц. і прадукцыйнасьці працы—33,9 пр.

Па кантрольных лічбах на 1930-31 год валавая прадукцыя па Беларускай рэспубліканскай прамысловасьці складае 748 мільёнаў, што дае павялічэньне ў параўнаньні з мінулым годам на 207 проц. Агульная колькасьць рабочай сілы складае 62.000, што дае павялічэньне на 48 проц., рост выпрацоўкі на аднаго рабочага роўны 39 проц.

У нашу сельскую гаспадарку па БССР у г. г. будзе ўкладзена 59 мільёнаў. Пасеўную плошчу мяркуецца павялічыць на 277000 га. Рост колектывізацыі перавысіў ва многа раз нашыя меркаваньні па 5-гадоваму пляну. БССР у канцы 1931 году павінна быць рэспублікай суцэльнай колектывізацыі.

4. Гэтыя посьпехі зьявіліся вынікам нябывалага росту політычнай актыўнасьці і ўздыму творчай энэргіі рабочае клясы, што знашло свой яскравы адбітак у пашырэньні сопбудаўніцтва, у разгортваньні соцыялістычнага спаборніцтва, шырокай пролетарскай самакрытыкі, ва ўздыме вытворчасьці працы і працоўнай дысцыпліны. Мы таксама маем надзвычайна вялікі рост актыўнасьці асноўных бядняцка-серадняцкіх мас сялянства і павялічэньне ініцыятывы ў праводжаньні вызначаных Партыяй і Савецкай уладай мерапрыемстваў.

5. Велізарныя дасягненьні ў галіне індустрыялізацыі краіны, колектывізацыі сельскай гаспадаркі і росту матар'яльнага і культурнага ўзроўню шырокіх працоўных мас, робяць зруйнавальны ўдар па рэлігіі. Няма ніякага сумненьня ў тым, што разбураючы матар'яльную базу рэлігіі, мы тым самым утвараем спрыяючыя ўмовы для выкрыцьця клясавай ролі рэлігіі перад шырокімі працоўнымі масамі, замену іх рэлігійнага сьветапогляду матэрыялістычным.

Цяпер, калі адбываюцца глыбокія соцыяльна-экономічныя зьмены ў нашай краіне, калі мы падышлі шчыльна да задачы канчатковага выкарчоўваньня карэньняў капіталізму і ліквідацыі кулацтва, як клясы, калі прышлі ў рух шырокія працоўныя масы, ваяўнічае бязбожжа становіцца рухам шырокіх мас.

6. У выніку масавага бязбожнага руху мы маем цэлы шэраг вельмі паказальных вынікаў і дасягненьняў. Па ініцыятыве ячэек СВБ у гэтым годзе было паднята пытаньне аб замене рэлігійнага сьвята спаса—днём індустрыялізацыі. Гэты дзень прашоў з вялікім посьпехам. З яшчэ большым посьпехам прашоў другі дзень індустрыялізацыі — каляды. Падрыхтоўка к другому дню індустрыялізацыі прашла, як вялікая політычная кампанія, зьвязаная з выкананьнем 5-цігадовага пляну.

Другім вялікім дасягненьнем у выніках значна ўзрослага бязбожнага руху за апошні час мы маем патрабаваньне працоўных аб зьняцьці званоў і аб перадачы будынкаў рэлігійнага культу пад культурныя патрэбы. Урэшце мы маем значны рост сяброў Саюзу Ваяўнічых Бязбожнікаў. Калі к 2-му ўсесаюзнаму зьезду Ваяўнічых Бязбожнікаў у нас налічвалася да 800000 сяброў СВБ, дык цяпер мы маем звыш 2000000. Па БССР улетку 1929 г. налічвалася 50000 сяброў СВБ, а зараз маецца звыш 100000.

7. Адзначаныя дасягненьні ў галіне росту і замацаваньня соцыялістычнага сэктару ў горадзе і вёсцы, ліквідацыя кулацтва, як клясы, бязумоўна, выкліча з яго боку яшчэ больш шалёнае супраціўленьне і павялічыць шкодную работу яго „службовага апарату—рэлігійных організацый розных колераў. Вось чаму патрабуецца больш узмоцненая пільнасьць з боку рабочае клясы і асноўных мас сялянства да манэўраў клясавага ворага.

Выкарыстоўваючы рэлігійныя настроі адсталых мас, папы, ксяндзы, рабіны і сэктанты вядуць сваю контррэволюцыйную работу. Не праходзіць ніводнай політычнай кампаніі, якую б духоўнікі ня імкнуліся сарваць. Аб контр-рэволюцыйнай рабоце духоўнікаў розных колераў на старонках нашага друку прыводзіцца шмат фактаў. У нас, па БССР кулакі, папы, ксяндзы і рабіны організоўваюць вандраваньне жабракоў у мэтах агітацыі супроць колгасаў. Маецца шмат фактаў, калі актывістыя сяляне-колгасьнікі забіваліся з-за кута кулацкімі наймітамі.

8. Вялікодныя сьвяты зьяўляюцца днямі, калі дзейнасьць папоўскіх, ксяндзоўскіх, рабінскіх і сэктанскіх організацый дасягае найвышэйшага стопню праз організацыю ўрачыстых набажэнстваў, розных працэсій, зьвязаных з казкамі аб уваскрасеньні хрыста і прыходзе яўрэйскага мэсіі.

У дні вялікадня рэлігійнікі будуць яшчэ больш узмоцнена мобілізаваць вакол сябе веруючыя масы, заклікаць іх да веры ў хрыста і мэсію і прынесьці ў ахвяру за гэту веру нават „свой живот“. Гэта азначае, што духоўнікі, выкарыстоўваючы рэлігійныя настроі, будуць натраўліваць цёмныя масы на савецкую ўладу. У сваёй рабоце нашы духоўнікі не адзінокія. Ім дапамагаюць духоўнікі і буржуазея ўсіх краін. Ва ўмовах шалёнай траўлі СССР з боку імпэрыялістых і ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. ліквідацыі кулацтва, як клясы ўнутры нашай краіны,— вялікдзень зьяўляецца асабліва шкодным сьвятам для працоўных. Вось чаму мы павінны падымаць і ўзбуджаць сьвядомасьць сярод працоўных мас з мэтаю выклікаць нянавісьць к рэлігійным сьвятам і казкам аб хрысьціянскім і яўрэйскім вялікадні.

9 У процілегласьць школьнай, падрываючай наша соцыялістычнае будаўніцтва, агітацыі рэлігійнікаў, у дні вялікадня неабходна правесьці яшчэ больш рашучую барацьбу з рэлігійнымі настроямі і рэлігійнымі організацыямі, зьяўляючыміся політычнай агэнтурай прыватна-капіталістычных элемэнтаў у нашай краіне. Аднак, барацьба з рэлігіяй не павінна адрывацца ад праводзімых партыяй і уладай політычных задач. Яна павінна быць цесна ўвязана з задачамі ліквідацыі кулацтва, з пропагандай за выкананьне 5-гадовага пляну ў 4 гады, за недапушчэньне прагулаў. за далейшае разгортваньне самакрытыкі, за пераход на бесьперапынку, за паднятце вытворчасьці працы. Разам з гэтым, неабходна весьці барацьбу за новы быт. Чым хутчэй веруючыя масы будуць парываць сувязь з рэлігійнымі забабонамі, чым хутчэй яны будуць адыходзіць ад рэлігійных організацый, тым хутчэй мы можам разаблачыць духоўнікаў усіх масьцей, якія сьвядома падтрымліваюць рэлігійныя сьвяты ў мэтах зацямненьня працоўных мас.

10. Праводзячы антырэлігійную работу, трэба весьці барацьбу са скажэньнямі ў гэтай працы. У апублікаванай 15-га сакавіка г. г. пастанове ЦК УсеКП(б) прапануецца весьці жорсткую барацьбу з практыкай зачыненьня будынкаў рэлігійнага культу ў адміністрацыйным парадку; прапануецца дапускаць зачыненьне будынкаў рэлігійнага культу толькі ў выпадку сапраўднага жаданьня большасьці сялян і ня інакш, як з зацьверджаньня пастаноў сходаў абласнымі выканкомамі, альбо ЦВК рэспублік. Але, побач з гэтым, неабходна змагацца з ліквідатарскімі настроямі ў адносінах да рэлігійнай прапаганды і недаацэнкай важнасьці барацьбы з рэлігіяй. Небясьпека гэтай недаацэнкі ў нас наглядаецца.

11. Антывялікодная кампанія сярод палякаў і беларусоў каталікоў праводзіцца ў гэтым годзе ў абставінах, калі рымскі папа —правадыр каталіцкай царквы,—зьвярнуўся з адозвай да ўсіх буржуазных краін аб неабходнасьці „крыжовага паходу“ супроць СССР.

У гэтай адозве папа займаецца хлусьнёю аб тым, што быццам у СССР прыгнечваецца рэлігія і, наогул—усе веруючыя людзі; акрамя таго, папа піша, што: „служачыя ўстаноў, мужчыны і жанчыны, прымушаюцца падпісваць формальныя заявы аб адступніцтве ад рэлігіі з хулой на бога, пад пагрозай пазбаўленьня картак на хлеб. адзеньня і інш.“ Усім вядома, што гэта зьяўляецца наглай хлусьнёю папы. Разам з папай злучылася расійская белагвардзейшчына, былыя князі, архіярэй, капіталістыя, Керанскі і Мілюкоў. Разам з імі выступаюць яўрэйскія рабіны Амэрыкі, Ангельшчыны і Польшчы, архіэпіскап Кэнтэрбэрыйскі—глава ангельскай царквы і рэлігійныя кіраўнікі ўсіх іншых рэлігій. Усе яны патрабуюць разам з папай, каб капіталістыя абвясьцілі крыжовы паход на бальшавікоў, гэта значыць вайну супроць СССР. Гэта наглае выступленьне буржуазнага сьвету на чале з намесьнікам бога—папай і папамі ўсіх рэлігій, зьўляецца падрыхтоўкай адзінага фронту супроць СССР.

Антывялікодная кампанія сярод яўрэяў павінна быць цесна ўвязана з клясавай сутнасьцю яўрэйскага пэйсаху, з высьвятленьнем шовіністычнай ідэі, пакладзенай у біблейскае апавяданьне аб паходжаньні яўрэйскага пэйсаху.

Неабходна завастрыць увагу працоўных яўрэяў на наступных момантах: яўрэйскі пэйсах навучае працоўных пакорнасьці богу і рабіну і гэтым адцягвае іх ад актыўнай барацьбы і ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве. Яўрэйскі пэйсах зацямняе клясавую сьвядомасьць бо ён вучыць, што ўсе яўрэі браты. Яўрэйскі пэйсах перашкаджае працоўным яднацца з працоўнымі другіх нацыянальнасьцяй.

13. Сьвята вялікадня зьяўляецца сьвятам п'янства і хуліганства. Неабходна завастрыць увагу працоўных на барацьбе за новы бязбожны быт і за адмаўленьне ад рэлігійных сьвят. Антывялікодная кампанія павінна зьвіцца штуршком паглыбленай і пашыранай антырэлігійнай працы, у асаблівасьці сярод жанчын, к пазбаўленьню іх ад бытавога закабаленьня рэлігіяй. Факты нашай беларускай сучаснасьці паказваюць, што часта організацыя колектываў затрымліваецца з-за рэлігійнасьці жанчын. Неабходна таксама разгарнуць бязбожную работу сярод дзяцей, організаваўшы іх у групы юных бязбожнікаў. Кіраўніцтва гэтай работай павінны ўзяць на сябе ячэйкі СВБ пры школах і настаўніцкія колектывы.

Вынаходца Паднос

Вынаходца прылаўка МЦРК тав. Паднос вынайшоў цікавую прыладу для разважкі розных прадуктаў (рыжу, круп і інш.).

На гэтай вынаходцы тав. Паднос ня спыніўся. Ён вынайшоў вельмі простую, але арыгінальную і карысную прыладу да звычайнага нажа. Пры дапамозе гэтай прылады нажом вельмі лёгка рэзаць падэшву, бо ўся сіла надаецца нажу ня пальцамі, як звычайна, а локцямі.



Акрамя гэтага тав. Паднос вынайшоў невялічкі апарацік, праз які шляхам пропуску ужо няпрыгодная стужка ад пішучай машынкі робіцца ізноў прыгоднай для далейшай работы.

Гэтая вынаходка дае для ўсяго СССР 300 тысяч рублёў экономіі ў год. Прэмію за першую вынаходку тав. Паднос цалкам асыгнаваў у фонд індустрыялізацыі краіны.

На здымку: Вынаходца Паднос з галоўнаю часткаю апарату для разважкі продуктаў.

„Чырвоная Зьмена“ дапамагла

— У Высачынскі РК КП(б)Б ...цебшчына) была паслана для ...сьледваньня заметка, што ... Сьцяклоў Ермалай, вычышча... савапарату па 2-му разраду, ...пуе ў Варашылаўскім спажыв... таварыстве. Сьцяклоў па зам... зьняты з працы.

— У Менскі Акрана была п... на для расьсьледваньня і ...няцьця мер заметка, у якой ...лася, што быўшым выхава... піонэрдому, накіраваным у ...цебск, ня былі выдадзены гр... Акрана паведамляе, што гр... перасланы.

— У № 71 „Чырвонай Зьм... быў зьмешчан артыкул, у як... салася аб тым, што сын б... абшарніка—Гурыновіч Адам ...чыцца ў Смаленскім доктар... універсытэце. Мы атрымалі ... на артыкул, што Гурыновіч ...ключан з універсытэту за ... ваньне соцыяльнага становіш...

— Рэдакцыяй была накір... на расьсьледваньне заметк... тым, што на пэдкурсах пры ...скім Белпэдтэхнікуме вуч... дачка кулака Юшкі. Па расьс... ваньню заметкі Юшка выкл... з курсаў.

— Па заметцы аб хуліган... нападзе грамадзян вёскі До... (Пухавіцкі р-н) Шыкуна і яго... роў на дзьвюх вучаніц з ... іх згвалціць, атрымана пав... леньне, што справа накір... ў суд.

— Па расьсьледваньню за... у якой пісалася, што ў ко... цыі Грыбавецкага сельсавету ...гілеўшчына) працаваў Ске... які п'янстваваў з хуліганамі, ...паведамілі, што Скерман п... метцы зьняты з працы.

— Па заметцы газэты „Чыр... Зьмена“: „Хуліганы зрываю... цу“ прыцягваюцца да судов... казнасьці Каваленка і Белаш...

Аб адчыненых концэртах Белрадыёцэнтру

Шэраг адчыненых концэртаў Белрадыёцэнтру для рабочых мас Менску праходзіць з надзвычайна вялікім уздымам.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“, у парадку трохмесячніку беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры, сумесна з Белрадыёцэнтрам, наладжвала два разы адчыненыя концэрты для рабочай моладзі і для чырвонаармейцаў. Гэтыя концэрты прыцягнулі шырокія масы рабочай моладзі. Рабочая моладзь вельмі зацікавілася гэтымі надзвычайна каштоўнымі пачынаньнямі. І зусім невыпадковы факты шчырых сяброўскіх прывітаньняў, з якімі заўжды сустракае ... гэтыя концэрты.

Трэба з усёй шчырасьцю св... што сваім высокамастацкім ...иленьнем, сваёй вялікай р... сваёй у большасьці ўдалай пр... май—концэрты Белрадыёцэнтр... выявілі сабе шырокую по... насьць.

Колектыў рэдакцыі газэты „Чыр... воная Зьмена“, карыстаючы... мантам, выносіць падзяку ... дыёцэнтру за яго жывы водг... ўсе пачынаньні, праводзімыя ... самольскай організацыяй і ... нам „Чырвонай Зьменай“.

Рэдакцыя „Чырвонай Зь...

Сабралі 200 рублёў

Комсамольцы, сумесна з працаўнікамі паштовага аддзяленьня пры мястэчку Крупкі, Аршанскай акругі, зрабілі выхад па ўцягненьню новых укладчыкаў у ашча... Сабрана 200 рублёў. Добра ... тага аднесьліся рабочыя і б... мястэчка Крупкі.

Антон Маладзе...

Паведамленьне

У сувязі з рэорганізацыяй вучоту і перадачы яго ў райкомы Мен АК ЛКСМБ прапануе ніжэй-памянёным ячэйкам Фрунзэнскага РК ЛКСМБ, не пазней 9-га красавіка даслаць у АК сьпісы на членаў і кандыдатаў вашай ячэйкі.

Таксама ў сувязі з перавучотам у працягу трох тыдняў неа... ні ў якім разе не пераводзіць ...рышоў з ячэйкі ў ячэйкі, бо ... наводзіць неразьбярыху і ... ніну. Сьпісы неабходна дасл... наступнай форме: прозьвіш... і імя па бацьку, стан, стаж ... год нараджэньня. У сувязі ... што маюцца выпадкі, калі ... членаў ячэек асабліва пр... ваныя не заносяцца у сьпіс... пануецца прыняць усе заха... члены і кандыдаты ячэйкі ў ... адзін прайшлі перавучот. Пр... віць сьпісы павінны нас... ячэйкі: Комунар, Белдзяр... Шпалерная фабрыка, Мэта... саюзныя, ДЭТ, Будаўнікоў ... ная. ААК, Цагельны завод ... курсы Комвузу, двух-гадовы... курсы. Меншвэй, двух хар... заводаў, галянтарэйная фа... конфэтная фабрыка, 1-ая ... ня, Дзяржгандальбел. Нарха... ловых МЦРК, Водаканал, тэ... ная фабрыка, аўтатранспар... кароў саюзная, групком ... коў, п-к абутнікаў. п-к кр... школа краўцоў. Політэхнікум ... БПТ. Музтэхнікум, БДВ, ... Наркамгандаль, Працасьвет... санпрацы, Камгас, Белдзяр... Дзяржтэатр, Саўгас „Розы Л... бург“, саўгас „Лекерта“, Л... НДІ, Профрух, прыгадны се...

Адкрылася навігацыя на Бярэзіне



На здымку: першы пасажырскі вераход з Барысава ў Бабруйск.

Адказны рэдактар ...
Рэдколе...

Менск, друкарня БДВ.

Галоўлітбел № 599